Хухлындина Л. Роль подпольной печати в разоблачении «Союза белорусской молодежи» и Белорусской центральной рады // Великая Победа: итоги и уроки. Тезисы межвузовской науч.-практ. конф. Мн., 1989. С. 65-67.

Паступіў у рэдакцыю 09.06.05.

*Руслан Вячаслававіч Ананьеў* - карэспандэнт «Народнай газеты».
*Пётр Лявонцьевіч Дарашчонак* - кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі журналістыкі і літаратуры.

*Н.А. ЗУБЧОНАК*

# ГАЗЕТА «НАРОДНЫ МСЦІВЕЦ» - ВЫДАННЕ СЛУЦКАГА РК КП(б)Б У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Анализируется содержание номеров слуцкой подпольной газеты «Народны мсцівец» в годы Великой Отечественной войны. Рассказывается о деятельности ее редакции по освещению борьбы партизан Случчины с немецко-фашистскими захватчиками.

The article considers the contents of Slutsk underground newspaper «Narodny Mstivets», it tells about the activity of its editorial staff covering the history of the fight of partisans in Slutsk region against fascist invaders in the years of the Great Patriotic War.

Партызанскі рух на поўдні Міншчыны хутка пашыраўся з вясны 1942 г., павялічваўся прыток патрыётаў у рады народных мсціўцаў. Вялікую ролю ва ўзмацненні масава-палітычнай работы адыгрывалі перыядычныя выданні, што выходзілі ў зоне дзейнасці партызанскіх злучэнняў. З 1 студзеня 1943 г. выдавалася газета «Патриот Родины» (орган міжраённага камітэта РК КП(б)), якая ўплывала на Капыльскі, Слуцкі і Уздзенскі раёны. Вясной 1943 г. пачала выходзіць газета «Сталінец» - выданне Грэскага падпольнага райкома партыі. А пасля стварэння ў студзені 1943 г. партызанскай брыгады № 64 імя Чкалава, якая была замацавана за Слуцкім раёнам у якасці арганізатара партызанскага руху і масава-палітычнай работы сярод насельніцтва, быў наладжаны выпуск выдання Слуцкага райкома партыі «Народны мсцівец». Дзейнасць гэтай газеты дагэтуль мала даследавана, нягледзячы на тое, што яе рэдактарам з'яўляўся Мікалай Еўкавіч Дастанка, які ў пасляваенны час абараніў кандыдацкую дысертацыю, працаваў на факультэце журналістыкі БДУ, быў заснавальнікам і першым загадчыкам кафедры радыё і тэлебачання.

Першы нумар «Народнага мсціўца» ўбачыў свет 1 красавіка 1943 г., але яшчэ раней у партызанскай брыгадзе Nq 64 з'явілася доўгачаканая лістоўка. «Шрыфт для стварэння партызанскай друкарні мне ўдалося вывезці з Любані з дапамогай падпольшчыкаў - дырэктара Любанскай друкарні Паўла Свірыдава і калгасніка Купрыяна Семянені, - пісаў у 1958 г. на старонках "Чырвонай змены" М.Е. Дастанка. - Як цяпер, помніцца, з якой невыказнай радасцю сустрэлі партызаны сваю першую друкаваную лістоўку» (Дастанка 1958, 3). Лістоўка пад назвай «Весткі з фронту» была выпушчана ў навагоднюю ноч 1943 г. і паведамляла аб выніках шасцітыднёвых баёў з вермахтам на подступах да Сталінграда. Лістоўкі шырока распаўсюджваліся на Любаншчыне і Случчыне, іх чакалі з прагнасцю і зачытвалі да дзірак, нягледзячы на тое, што за знойдзены пры вобыску аркуш паперы з заклікамі ці адозвамі гітлераўцы каралі людзей смерцю. У час сумесных аперацый партызаны, здаралася, наладжвалі абмен: 5-10 патронаў за свежую лістоўку.

Вясной 1943 г. жыхары Случчыны і партызаны мясцовых атрадаў пачалі атрымліваць газету «Народны мсцівец» - орган Слуцкага падпольнага РК КП(б)Б. 14 красавіка 1943 г., праз два тыдні пасля выхаду першага нумара, на пасяджэнні Слуцкага падпольнага райкома партыі быў зацверджаны склад рэдакцыі. Рэдактарам прызначылі Мікалая Еўкавіча Дастанку, у склад рэдкалегіі ўвайшлі Пётр Дзям'янавіч Локцеў і Іван Васільевіч Куляшоў (НА РБ. Ф. 4). Ва ўспамінах аб першых кроках газеты-партызанкі Мікалай Еўкавіч пісаў: «Спачатку газету "Народны мсцівец" мы выпускалі ўдвух з Іванам Куляшовым... Пачынаючы з мая 1943 года, у нас быў поўны штат работнікаў рэдакцыі і друкарні: прыйшоў у рэдакцыю настаўнік Іван Хатэнка, а потым узялі літработнікам партызана Віктара Плешавеню... У друкарні працавалі наборшчыкамі камсамолка Люба

Куляшова і Люба Шаўчук, а друкарамі - камсамолец Уладзімір Канановіч І Коля Торхаў, якому было гадоў дванаццаць. Доўгі час наша друкарня знаходзілася ў Загальскіх балотах на востраве Горнае. У вялікай зямлянцы былі абсталяваны наборныя касы, зроблен прымітыўны друкарскі станок. Тут мы працавалі, тут І жылі. Працавалі, не адчуваючы стомленасці, не пакладаючы рук... Нярэдка сапраўды даводзілася друкаваць, набіраць, рыхтаваць паперу без перапынку цэлымі суткамі» (Дастанка 1958).

«Нельга пералічыць зверскія ўчынкі гітлераўскіх кравапіўцаў, нельга пералічыць імёны нашых людзей, якія загінулі ад рукі нямецкіх катаў. Яны, ап'янеўшыя ад народнай крыві, шукаюць новых повадаў, каб знішчыць беларускі народ. У акупіраваных немцамі раёнах ходзіць эпідэмія тыфусу. Усё насельніцтва, захварэўшае на тыф, немец бязлітасна знішчае. Так, у Слуцку ім спалена каля 2000 чалавек. Сэрца сціскаецца ад болю, калі бачыш, што робіць вораг з нашым народам...» - гэтымі радкамі пачыналася публікацыя «Рэжым рабства, тэрору І насілля», надрукаваная ў газеце «Народны мсцівец» 11 красавіка 1943 г. Падпольнаму выданню, у кожным нумары якога выкрываліся злачынствы нацыстаў, здзекі захопнікаў над мірнымі людзьмі, было наканавана адыграць значную ролю ў пашырэнні партызанскага руху і ўзмацненні масава-палітычнай работы сярод партызан і жыхароў Случчыны.

У справаздачы Слуцкага падпольнага райкома КП(б)Б Мінскаму абкому КП(б)Б аб праведзенай рабоце адзначалася, што рэдакцыяй газеты «Народны мсцівец» за перыяд з красавіка па 1 жніўня 1943 г. выпушчана 17 965 экз. газеты і лістовак. Газета выходзіла адзін раз у тыдзень па нядзелях агульным тыражом 250-300 экз. Толькі за чэрвень месяц выдадзена 1900 экз. газеты і 8700 экз. лістовак. Тэматыка лістовак была разнастайнай: «Весткі з фронту», «Весткі з Савецкай Радзімы», «Да паліцэйскіх і асоб, што знаходзяцца на службе ў немцаў», «Да моладзі Слуцкага раёна», «Да працоўных Слуцкага раёна», «Да чэхаў і славакаў» і інш. (НА РБ. Ф. 3968). За непрацяглы час вакол газеты згуртаваўся шы!рокі аўтарскі калектыў, які налічваў больш за 120 чалавек. Найбольш актыўнымі аўтарамі былі І.С. Канановіч - сакратар Слуцкага падпольнага райкома КП(б)Б, Карнееў, Абухва, Бялько, Скрылёў, Радкевіч, Радзюк, Верамейчык, Шаўцоў, Рыклін, Луцэвіч. Усяго ў тыле ворага выйшла 78 нумароў газеты агульным тыражом 37 300 экз., з іх у 1943 г. № 1-53, у 1944 - № 1-2 (54-55) - 25(77). Апошні нумар газеты ў зоне партызанскіх злучэнняў выйшаў 25 чэрвеня 1944 г. Таксама было выдадзена 72 000 экз. лістовак і адозваў, іншых агітацыйна-прапагандысцкіх матэрыялаў (Памяць... 2000, 295).

Першая старонка «Народнага мсціўца» мела звычайнае для таго часу афармленне: уверсе характэрныя лозунгі: «Смерць нямецкім акупантам!» і «Прачытаў - перадай другому». Побач з загалоўкам газеты, у шпігелі, змяшчаліся закпікі, цытаты, вершы, практычна ўсе нумары пачыналіся з рэдакцыйных артыкулаў. Газета мела пастаянныя рубрыкі: «Весткі з фронту», «За граніцай», «Да савецкага насельніцтва», «Паведамленні Саўінфармбюро» і інш. Газета і выпушчаныя ў партызанскай друкарні лістоўкі карысталіся сярод жыхароў вялікай папулярнасцю. «У г. Слуцку на рынку за газету "Народны мсцівец" і нашы лістоўкі плацяць па 50 руб. Нямецка-фашысцкую літаратуру насельніцтва ненавідзіць... Пры з'яўленні нашых партызан у вёсках жыхары заўсёды пытаюцца: "Дайце, калі ласка, нам лістоўку ці газету"», - адзначалі ў справаздачы кіраўнікі Слуцкага райкома партыі (Памяць... 2000, 295).

З цягам часу аб'ём газеты павялічыўся, у 1944 г. «Народны мсцівец» выдаваўся ўжо на чатырох старонках замест ранейшых двух. Больш разнастайным стаў змест. У шматлікіх артыкулах, зваротах, адозвах, паведамленнях «Народны мсцівец» паказваў рэальную карціну народнай барацьбы. Газета пісала гісторыю народнага змагання з ворагам І часам ледзь не па днях і тыднях можна прасачыць, што адбывалася ў зоне дзеяння партызанскіх атрадаў Случчыны. Газетныя старонкі - гэта яшчэ і гісторыя ў дакументах і асобах, а публікацыі, што захаваліся праз многія дзесяцігоддзі пасля вайны, падчас з'яўляюцца адзінай крыніцай інфармацыі пра таго ці іншага чалавека.

У нумары за 13 чэрвеня 1943 г. «Народнага мсціўца» змешчаны невялікі допіс у рэдакцыю «Задание выканалі»: «Я і партызаны Міхаіл Н. і Косця Х., атры-

маўшы баявое задание, пайшлі яго выконваць. Перш-наперш мы пашкодзілі тэлефонна-тэлеграфную сувязь па шляху Слуцк - Урэчча на працягу 3-х кіламетраў. Заўважыўшы, што на гэтай дарозе ходзяць нямецкія машыны, мы парашылі яе замініраваць. Міна дарэмна не прапала. Скора сюдой ішла сямітонка. Яна ўзляцела ў паветра. Забіта тры гітлераўцы» (Хасаін 1943). Такія матэрыялы займалі значную плошчу на старонках газеты. Спачатку яны падаваліся выпадкова, але паступова рэдакцыя пачала сістэматызаваць інфармацыю. Напрыклад, газета-партызанка рэгулярна друкавала матэрыялы, у якіх заклікала сялян хаваць сабраны хлеб і не аддаваць нямецкім акупантам.

У суботнім нумары «Народнага мсціўца» за 1 студзеня 1944 г. з'явілася інфармацыя «Зборнік вершаў "Слуцкі пояс"». Пад гэтай назвай партызанская друкарня выпусціла зборнік вершаў А. Астрэйкі (Астрэйка 1943). Выданне афармілі мастакі С. Залаты і С. Бяляеў. Гэта быў унікальны для паэзіі ваеннага часу зборнік. Самыя лепшыя вершы (іх налічвалася 22) былі сабраны ў асобную кніжку. Пасля баявой сутычкі з ворагам партызаны здабылі паперу, выразалі драўляныя застаўкі-клішэ, фарбай служыла вакса з сажай. Кніжка вершаў, адказным за выпуск якой з'яўляўся М.Е. Дастанка, пачыналася словамі аўтара: «Прысвячаю слуцкім партызанам брыгады імені Чкалава». Прадмову да зборніка напісаў сакратар Слуцкага падпольнага раённага камітэта КП(б)Б І.С. Kaнановіч. Ён адзначаў: «У кожным слове паэта - лютая нянавісць да чужынцаў, гітлераўскіх людаедаў і гарачы заклік да беларускага народа - шырэй раздуваць полымя ўсенароднай партызанскай вайны ў тылу ворага, каб хутчэй вызваліць родную зямлю ад нямецкіх акупантаў». У кнізе змешчаны вершы: «Беларусь-партызанка», «Час расплаты», «Песня разведчыка», «Наперад» і інш. Патрыятычныя вершы А. Астрэйкі, які па заданні Беларускага штаба партызанскага руху знаходзіўся ў той час у тыле ворага, сталі сапраўднай зброяй салдат, партызан і мірных жыхароў у барацьбе з акупантамі, той кропляй крынічнай вады, што жывіла душу ў страшныя гады вайны. У вершы «Партызанскі лагер» - трывога і боль, адчуванне жыцця, якое не спыняецца ні на хвіліну, быт салдат І партызан, няхай не ўладкаваны, але не гэта зараз галоўнае: «Патрэбна будзе, стануць печы // І з бляхі каміны, // Каб дух паддзержаць чалавечы // У холад ледзяны».

У вершы «У лесе» паэт пісаў пра тое, што нават у суровыя гады ваеннага ліхалецця воіны-партызаны заставаліся чалавечнымі, шчырымі, удзячнымі той зямлі, якая дала жыццё і якая дапамагае ў барацьбе з ворагам: «Я слаўлю словам гартаваным, // Як гордасць нашае зямлі, // Лясы, балоты і паляны, // Што беларускім партызанам // Біць ворага дапамаглі».

Трапнае лірычнае і ў той жа час публіцыстычнае слова набліжала перамогу. Яго сіла ўздзеяння на чытача была не меншая, чым сіла палымянага артыкула-заклікa, сатырычнага апавядання. Паэт неаднойчы падкрэсліваў, што ў жорсткіх умовах вайны салдат не толькі навучыўся ненавідзець ворага, але не развучыўся любіць родную зямлю, родных і сяброў.

Выдатныя вершы А. Астрэйкі ваеннага часу, надрукаваныя ў зборніку «Слуцкі пояс», загартоўвалі, выхоўвалі лепшыя чалавечыя якасці. Яны неслі рэальную інфармацыю пра падзеі на франтах, у партызанскіх атрадах, у тыле ворага. У рэшце рэшт, яны рабілі больш поўнай карціну ваенных падзей і ў той жа час фарміравалі грамадскую думку (Бельскі 1997, 8-9).

За чатырнаццаць месяцаў працы ў якасці рэдактара М.Е. Дастанка не толькі арганізаваў, падрыхтаваў да друку сотні публікацый, але і напісаў шэраг палымяных артыкулаў, замалёвак, матэрыялаў іншых жанраў. Яго пяру належаць перадавыя артыкулы «Паднімайся на барацьбу» (Дастанка 1943, 3чэрв.), «Усе сілы і сродкі на разгром ворага» (Дастанка 1943, 13 чэрв.), «Шлях барацьбы і перамог» (Дастанка 1944, 1 студз.), «Да барацьбы, моладзь Случчыны!» (Дастанка 1943, 5 вер.) і інш. Аўтар выкрываў бесчалавечныя мэты Саюза беларускай моладзі: «Аднойчы з-пад Слуцка я атрымаў запіску ад сакратара Слуцкага падпольнага райкома партыі Андрэя Сцяпанавіча (такой была падпольная клічка тав. Канановіча Іпаліта Селівестравіча...), у якой паведамлялася аб намерах гітлераўцаў стварыць фашысцкую маладзёжную арганізацыю. Ён прапаноў-

ваў выкрываць гэты новы намер гітлераўцаў у газеце і спецыяльнай лістоўцы. Усю ноч свяціліся невялічкія вокны нашай зямлянкі. У газеце паявіўся рэдакцыйны артыкул "Новы манеўр гітлераўцаў"».

«Гітлераўцы пусціліся на новую правакацыю, - гаварылася ў артыкуле. - Генеральны камісар Беларусі Вільгельм Кубэ, або як проста яго называюць бандыт у кубе, па загаду сваіх гаспадароў рашыў арганізаваць "Саюз беларускай моладзі". Для моладзі, уступіўшай у фашысцкі саюз, нават прыдумана кпяймо-ромб, на ім чалавечы чэрап, два крыжы, рыдлёўка і кінжал, над якімі надпіс: "СБМ" - напэўна, "смерць беларускай моладзі"» (Дастанка 1958, 3). У матэрыяле не толькі выкрывалася каварная задума гітлераўцаў, але і гучаў заклік да барацьбы. У гэтым жа нумары быў змешчаны верш супрацоўніка рэдакцыі І. Хатэнкі «Не ідзі ў нямецкую няволю»: «Не паддавайся злой прыманцы, // Прадбач абман заўчасна ты, // Глядзі, каб сілаю паганцы // Не завязлі цябе туды, // Туды, дзе церпяць здзекі, мукі, // Дзе з паднявольных кроў і пот // П'юць фашысцкія гадзюкі, // Дзе правіць Гітлер-ідыёт. // Не ідзі ў няволю на чужыну: // Загінеш марна, памятай. // Лепш змагайся за Радзіму, // За свой народ, за вольны край. // Хутчэй бяры ты зброю ў рукі, // Нямецкі зброд даві, калі, // Пакуль фашысцкія гадзюкі // Па нашай поўзаюць зямлі».

Матэрыялы Дастанкі-публіцыста на старонках «Народнага мсціўца» вызначаюцца трапнасцю, паказваюць падзеі ў дынаміцы, глыбока раскрываюць вобразы народных мсціўцаў. У замалёўцы «На Урэччы» аўтар шляхам простага параўнання таго, як жылі людзі да прыходу немцаў і як жывецца ім пры «крывавым парадку», дабіваецца высокага публіцыстычнага гучання публікацыі: «Нядаўна фашысцкія прыхвасні згвалтавалі цяжарную жанчыну Сцёпу Х. У дом Івана В. уварваліся два п'яныя фашысты. Яны выгналі з дому дзяцей і самога Івана. Пакінуўшы ў кватэры жонку, пад пагрозай напалі на яе і згвалтавалі. Нянавісцю поўняцца сэрцы ўрэчцаў за крывавыя справы гітлераўцаў... LUtoдзённа дзесяткі ўрэчцаў уходзяць у рады народных мсціўцаў, каб са зброяй у руках хутчэй ачысціць родную зямлю ад нямецкай погані (Дастанка 1943, 3 чэрв.). У другой публікацыі - падборцы «Дапамога народа», куды ўвайшлі тры невялікія інфармацыі, аўтар на канкрэтных прыкпадах паказаў, як сяляне дапамаглі народным мсціўцам - дзе трафейную зброю зберагалі, дзесьці нямецкую засаду заўважылі і папярэдзілі разведчыкаў, а дзе з дапамогай партызан нава г мост спалілі - каб не было магчымасці немцам-рабаўнікам трапіць у вёску (Дастанка 1943, № 12).

У 1944 г. газета змясціла тры замалёўкі галоўнага рэдактара пад агульнаи назвай «Слуцкія людзі», у якіх расказвалася пра камбрыга брыгады імя Фрунзё, камандзіра і камісара партызанскага атрада імя 14 Слуцкіх партызан. «Такі< слуцкіх людзей - важакоў партызанскіх атрадаў - многа. Случчане занялі ганаровае месца ў радах барацьбітоў за вызваленне сваёй краіны», - падводзіў вынікі дзейнасці патрыётаў краю аўтар (Дастанка 1944). Многія рэдакцыйныя матэрыялы рыхтаваліся з мэтай выкрыцця намераў захопнікаў па стварэнні ў Беларусі розных прафашысцкіх калабаранцкіх арганізацый, у прыватнасці «Беларускай краёвай абароны». Рэдакцыя праз газету і лістоўкі вяла контрпрапагандысцкую работу сярод насельніцтва з мэтай недапушчэння мабілізацыі мужчын у гэта варожае фарміраванне, тлумачыла сутнасць каварных планаў гітлераўцаў.

Нават пасля вайны былы галоўны рэдактар «Народнага мсціўца» працягваў пісаць пра тых людзей, якія дапамагалі партызанам, рэдакцыі газеты. Успаміны чалавека, які быў сведкам падзей, сёння асабліва каштоўныя, бо, спалучаючы ў сабе гістарычныя факты з эмацыянальнасцю, глыбокім пранікненнем у псіхалогію людзей, яны маюць вялікую сілу ўздзеяння. Менавіта так, вуснамі сведкаў, гісторыя размаўляе з нашымі сучаснікамі. У 1979 г. у часопісе «Здравоохранение Белоруссии» М.Е. Дастанка змясціў нарыс «Партызанскі стаматолаг». Расказваючы пра дзейнасць падпольных камсамольска-маладзёжных патрыятычных груп, жыхароў суседніх вёсак, якія загінулі ў выніку фашысцкіх карных аперацый, публіцыст напісаў пра дзейнасць зубаўрачэбнага кабінета ў вёсцы Зельнае і яго загадчыка - урача-стаматолага Леаніда Васільевіча Самусевіча.

Медработніку даводзілася аказваць тэрміновую дапамогу не толькі партызанам свайго атрада, але і суседняга, які насіў імя 14 Слуцкіх партызан. Нават у баях ён заўсёды меў з сабой медыцынскае абсталяванне. Гэтага чалавека з удзячнасцю ўспамінаюць усе тыя, з кім звёў яго лёс на цяжкіх баявых дарогах. Дапамагаў гэты чалавек таксама і газеце.

«Я і зараз помню, як зайшоў у хату, асцярожна пастукаў у дзверы, якія ўпрыгожвала таблічка "Зубаўрачэбны кабінет", - пісаў М.Е. Дастанка. - Мяне прыветліва сустрэў малады высокі ў белым халаце чалавек. Гэта быў Леанід Васільевіч Самусевіч. Мне як рэдактару Слуцкай падпольнай газеты неабходна было пагутарыць з тымі, хто застаўся жывым пасля разгрому гітлераўцаў. Мы пазнаёміліся. Я расказаў яму, што выпускаю газету і лістоўкі. Прыемна было чуць словы падзякі за газеты, якіх, як адзначыў Леанід Васільевіч, чакалі днём і ноччу, якія дапамагалі дыхаць, улівалі жыццё ў нашы сэрцы» (Дастанка 197$, 12-13).

М.Е. Дастанка шмат рабіў, каб «Народны мсцівец» стаў змястоўным, цікавым выданнем, даваў сваім чытачам інфармацыю, здольную абудзіць лепшыя патрыятычныя пачуцці. Дзякуючы яму выданне стала living разнабаковым, імкнулася ахапіць усе сферы тагачаснага жыцця, нягледзячы на скпаданыя ваенныя ўмовы. Газета друкавала не толькі палымяныя публіцыстычныя артыкулы-заклікі, але і пісала пра звычайных людзей, што кавалі перамогу над фашызмам 60 гадоў таму. Дзейнасць газеты Слуцкага райкома партыі «Народны мсцівец» - гэта толькі адна выдатная старонка з гісторыі больш чым 170 падпольных выданняў гадоў Вялікай Айчыннай вайны. Выданне выкарыстоўвала самыя розныя формы і метады падачы матэрыялаў. Партызанская газета - гэта яшчэ і крыніца дакументальнага і публіцыстычнага характару пра барацьбу патрыётаў Случчыны з гітлераўскімі захопнікамі. Палымянае і праўдзівае слова савецкіх публіцыстаў, няштатных аўтараў дазваляла распаўсюджваць інфармацыю пра падзеі на франтах у глыбокім тыле ворага, у акупіраваных раёнах, партызанскіх атрадах. Менавіта таму газета I заняла сваё пачэснае месца ў сістэме перыядычнага друку ваеннага часу.

ЛІТАРАТУРА

Астрэйка А. Слуцкі пояс. Вершы: 36. Слуцк, 1943.
Бельскі А. Асоба I творчасць А. Астрэйкі // Роднае слова. 1997. № 3. С. 8-9.
Дастанка М. Дапамога народа // Народны мсцівец. 1943. 13 чэрв.
Дастанка М.На Урэччы // Народны мсцівец. 1943. 3 чэрв.
Дастанка М. Партызанскі стаматолаг//Здравоохранение Белоруссии. 1979. № 7. С. 12-13.
Дастанка М. Слуцкія людзі // Народны мсцівец. 1944. 1 студз.
Дастанка М. Старонкі жывой гісторыі // Чырвоная змена. 1958. 5 мая. С. 3.
НА РБ. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 274. Л. 2.
НА РБ. Ф. 3968. Воп. 1. Спр. 2. Л. 11-55.
Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Слуцкага раёна I г. Слуцка: У 2 кн. Мн., 2000. Кн. 1.
Хасаін В. Задание выканалі // Народны мсцівец. 1943. 13 чэрв.

Паступіў у рэдакцыю 09.06.05.

*Наталля Анатольеўна Зубчонак* - кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі і літаратуры факультэта журналістыкі.

*Н.Б. РАШЭТНІКАВА*

## ТЭМА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ШКОЛЬНЫМ КУРСЕ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Освещены концептуальные подходы к изучению военной прозы в курсе белорусской литературы; раскрывается система работы, направленная на формирование у школьников необходимых знаний и умений. Особенный акцент делается на решении проблемы нравственного воспитания молодежи.

The article covers the conceptual approaches to studying «war» prose in the course of Belarusian literature; the system of work aimed at formation of required for schoolchildren knowledge and skills has been revealed. Special emphasis is made on the problem of moral upbringing of youth.

Ваенная тэма - адна з асноўных у творчасці беларускіх пісьменнікаў другой паловы XX ст. і ў школьным курсе беларускай літаратуры, спецыфіка выкла-